

DC COMICS
THE NEW 52!
BATMAN
37 $3.99 US
SNYDER
CAPULLO
MIKI
PLASCENCIA
DIRECT SALES
FEB 2015
RATED T TEEN
75 YEARS of BATMAN
.BY
КОМІКСЫ ПА-БЕЛАРУСКУ
БЭТМЭН
#37 (2011)
ПЕРАКЛАД
І АФАРМЛЕННЕ:
КОЗЫРАЎ СЯРГЕЙ




УГЛЯДЗІСЯ Ў ЯГО.
УГЛЯДЗІСЯ І СКАЖЫ САБЕ, ШТО ТЫ БОЛЬШ, ЧЫМ ЧАЛАВЕК. ТЫ ЛЕПШ ГЭТАГА. ТАБЕ НЕ ТРЫЦЦАЦЬ ДВА І ТЫ НЕ ПРЫКАВАНЫ ДА КРЭСЛАЎ.
АТРУЧАНЫ. ПАРАЛІЗАВАНЫ...
ЁН ПРОСТА ЯШЧЭ АДЗІН ЗЛАЧЫНЦА І ГЭТА ПРОСТА ЯШЧЭ АДНА СПРАВА.
ТЫ ВЕДАЕШ ГЭТА. ДЫК **УБАЧ** ГЭТА. УБАЧ ГЭТА БЕЗ АПТЫЧНЫХ ЭКРАНАЎ, БЕЗ ПЛАШЧА. ГЛЯДЗІ. ТЫ БАЧЫШ ГЭТЫЯ ЗРЭНКІ, ШТО ЗВУЗІЛІСЯ АД НЯНАВІСЦІ, АЛЕ ЗМАГАЙСЯ З ІМІ. НЕ ДАЗВАЛЯЙ ІМ ПАКАЗВАЦЦА, НАВАТ ЗАРАЗ. НАВАТ КАЛІ РАСЦЯГВАЕЦЦА **ЎСМЕШКА**...
BATMAN: ENDGAME PART THREE
WRITER SCOTT SNYDER PENCILLER GREG CAPULLO
INKER DANNY MIKI COLORIST FCO PLASCENCIA
LETTERERS DEZI SIENTY & TAYLOR ESPOSITO
COVER CAPULLO, MIKI & PLASCENCIA
VARIANT COVERS BY ANDY KUBERT & BRAD ANDERSON AND DARWYN COOKE
ASSISTANT EDITOR MATT HUMPHREYS
EDITOR MARK DOYLE
BATMAN CREATED BY BOB KANE
ТЫ БОЛЬШ СВАІХ ПАЧУЦЦЯЎ.
БОЛЬШ СВАЙГО ЦЕЛА. ТВАЁ СЭРЦА, ТВАЕ ВОЧЫ...
...ТЫ **БЭТМЭН**. І ТЫ СПЫНЕШ ЯГО. ЯК І ЗАЎЖДЫ. ТЫ СПЫНЕШ УСЁ ГЭТА...




...ЯК-НЕБУДЗЬ.
BIOHAZARD
ААААА!
БРУС!
СЭР! ВАМ СТАЛА ЛЯГЧЭЙ. ВЫ...
Я... КХА... У ПАРАДКУ. ТАКСІН... КХА... ГЭТА НЕЙКАЯ ЗМРОЧНАЯ АНЕСТЭЗІЯ. Я БЫЎ **У ПРЫТОМНАСЦІ**, БАДЗЁРЫМ, АЛЕ МАЕ ВОЧЫ НЕ МАГЛІ СФАКУСІРАВАЦЦА. МОЙ СЛЫХ БЫЎ ПРЫГЛУШАНЫ... ЗДАВАЛАСЯ, БЫЦЦАМ Я ПАД ВАДОЙ. ЁН ЗРАБІЎ ГЭТА? ВЫПУСЦІЎ **ВІРУС**?
МЫ З ЦЯЖКАСЦЮ ВЫБРАЛІСЯ З ГОРАДА І АДВЯЗЛІ ВАС У **АРКХЭМ**, МАЙСТАР БРУС.
У ГЭТЫ ЧАС ЦЭНТР ГОРАДА ЎЖО БЫЎ У АДБЫМКАХ ВАР'ЯЦТВА.
ГЭТА БЫЛО ПЕКЛА... ПАВЕРЫЦЬ НЕ МАГУ. ВАЙСКОЎЦЫ, КАМІТЭТ ГО І ПАЛІЦЫЯ, ЯНЫ СПРАБУЮЦЬ СТРЫМЛІВАЦЬ УСЁ Ў МЕЖАХ ГЭТЫХ **ЧЫРВОНЫХ** ЗОН, ТРЫМАЮЦЦА НА ЖОЎТЫХ.
АЛЕ ГЭТА... Я НІЧОГА ПАДОБНАГА ЯШЧЭ НЕ БАЧЫЛА.
Я ПАВІНЕН ПАГЛЯДЗЕЦЬ.


КАМІТЭТ ГО ЎЗЯЛІ ЎЗОРЫ КРЫВІ. ПАКУЛЬ УСЕ НЕ ВЫЙШЛА З-ПАД КАНТРОЛЮ. ВОСЬ ЯНЫ.
ПЕРАНОСІЦЦА ПА ПАВЕТРЫ?
МЕНАВІТА. МІКРАСКАПІЧНЫЯ КРОПЛІ ПАТАГЕНА, ПАКРЫТЫЯ СЛІЗЗЮ, РАССЕЙВАЮЦЦА Ў ПАВЕТРЫ КОЖНЫ РАЗ, КАЛІ ХВОРЫ КАШЛЯЕ, ПЛЮЕ ЦІ...
...СМЯЕЦЦА, КАНЕШНЕ.
BIOHAZARD
ВІРУС, ЯКІ РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА, ЯК СМЕХ.
СМЕХ - ГЭТА ТОЛЬКІ ШЭРАГ СПАЗМАЎ ДЫЯФРАГМЫ... ЧАСТЫ КАШАЛЬ.
ПРАКЛЯЦЦЕ.
BIOHAZARD
І ЯНЫ ПРОСТА... ПРАЦЯГВАЮЦЬ СМЯЯЦЦА, БРУС.
ВЫ ПРЫТРЫМЛІВАЛІСЯ МАЙМУ ПРАТАКОЛУ?
«КАНЕШНЕ, СЭР. МЫ ЗАПУСЦІЛІ СІМУЛЯЦЫЮ З АНТЫТАКСІНАМ, АЛЕ..»
«АЛЕ ШТО, АЛЬФРЭД?».
«ШТО Ж, ВІДАЦЬ, ЁН ПРАЦУЕ, АЛЕ ПОТЫМ...»
«...АЛЕ ПОТЫМ ВІРУС ДАЕ АДПОР».
«У ШТАММЕ, ЯКІ ЁН СТВАРЫЎ, ЁСЦЬ НЕШТА НОВАЕ, СЭР. ШТОСЬЦІ ЎСТОЙЛІВАЕ... ШТО Ж, ШТОСЬЦІ, ШТО ЗДАЕЦЦА ПРАКТЫЧНА...»
«...НЕНАТУРАЛЬНЫМ. ЁН ЗАРАЗНЫ, ХУТКАДЗЕЙНЫ І, ВІДАЦЬ, НЕПАРАМОЖНЫ. БАЮСЯ, ГЭТА ЯГО ШЭДЭЎР, СЭР».



НЯМА НІЧОГА НЕПЕРАМОЖНАГА. НІ ЁН, НІ ГЭТА. ЗА АПОШНІЯ ГАДЫ Я СТВАРЫЎ АМАЛЬ **СОТНЮ** ЛЕКАЎ АД ТАКСІНА ДЖОКЕРА.
АНТЫТАКСІНЫ, АНТЫБІЁТЫКІ, СТЭРОЙДЫ... КОЛЬКІ ВЫ ЎЖО ВЫПРАБАВАЛІ?
...
БРУС...
BIOHAZARD
TOXIN 1-173
...МЫ ВЫПРАБАВАЛІ **ЎСЕ**.
JOKER TOXIN
І Ў ВЫНІКУ НІЧОГА НЕ ПАДЗЕЙНІЧАЛА. НАВАТ **КРЫХУ**. ЯК СКАЗАЎ ТАТА, У ЗЛУЧЭННІ ЁСЦЬ ШТОСЬЦІ... НЕЙКІ **ТАЕМНЫ** ЭЛЕМЕНТ, ЯКІ МЫ НІЯК НЕ МОЖАМ АДОЛЕЦЬ.
МЫ НЕ ВЕДАЕМ, ШТО РАБІЦЬ.
ЗНАЙДЗІЦЕ ПЕРШЫ ВЫПАДАК.
BIOHAZARD
ВОСЬ. **ГОТЭМСКАЯ ПРЫСВІТЭРЫЯНСКАЯ БАЛЬНІЦА**. АЛЕ НАВОШТА...
ХТО Б НІ БЫЎ **ПЕРШЫМ** ПАЦЫЕНТАМ, ЁН ПРЫЙШОЎ У ШПІТАЛЬ РАНЕЙ, ЧЫМ ВІРУС ЦАЛКАМ ПРАЯВІЎСЯ. ЁН БЫЎ НОСЬБІТАМ.
З НЕЙКІМ ПАЧАТКОВЫМ **ІМУНІТЭТАМ**.
«ІНФЕКЦЫЙНАЯ ПАЛАТА Ў ПРЫСВІТАРЫЯНСКАЯ БАЛЬНІЦЫ – ГЭТА ЦАЛКАМ ІЗАЛЯВАНАЕ ПАМЯШКАННЕ. ХТО Б НІ БЫЎ НУЛЁВЫМ ПАЦЫЕНТАМ, ЁН, ХУТЧЭЙ ЗА ЎСЁ, УСЁ ЯШЧЭ ТАМ. КАЛІ Я ЗМАГУ АТРЫМАЦЬ ВЫРАЗ У ГЭТАГА ЧАЛАВЕКА, Я, НАПЭЎНА, ЗМАГУ ЗНАЙСЦІ АНЦІЦЕЛЫ».
«Я ПАЙДУ З ТАБОЙ».
«НЕ, ТЫ ДАПАМОЖАШ АДСЮЛЬ».
«УЛІЧВАЮЧЫ ЎСЁ, ШТО...»
«ТАКАЯ ТВАЯ ПРАЦА, ДЖУЛІЯ».


«Я ЗМАГАЎСЯ З ЗАГОНАМ...»
СКАЖЫ, ШТО Ў ЦЯБЕ ЁСЦЬ ЛЕКІ. Я ЧАКАЮ Ў ТЭРМІНАЛА.
ЯШЧЭ НЯМА.
ПРАКЛЯЦЦЕ... ДОБРА, ТЫ Ў ПАРАДКУ? ШТО З ТАБОЙ ЁН ЗРАБІЎ?
Я Ў ПАРАДКУ. УЖО НАКІРОЎВАЮСЯ ТУДЫ.
««УЖО» – ГЭТА МУЗЫКА ДЛЯ МАІХ ВУШЭЙ. ТУТ УСЁ КОЦІЦЦА ДА ЧОРТА, БЭТМЭН. І ХУТКА. ВАЙСКОЎЦЫ ЗБІРАЮЦЦА ІЗАЛЯВАЦЬ НАС. ГЭТЫ ВІРУС РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА ХУТКА, ЯНЫ НЕ ПАСПЯВАЮЦЬ СТРЫМЛІВАЦЬ».
«КАЛІ МЫ НЕ ЗНОЙДЗЕМ ЛЕКІ ЦЯГАМ БЛІЖЭЙШЫХ **ГАДЗІН**, У ГОРАДЗЕ АБ'ЯВЯТ КАРАНЦІН. ЯНЫ ВЯЗУЦЬ **СЦЕНЫ**».
«ЯНЫ САПРАЎДЫ БУДУЮЦЬ СЦЕНЫ, БЫЦЦАМ ЗАРАЗ СЯРЭДНЯВЕЧЧА. ТАКІМ ЧЫНАМ: ЯКІ ПЛАН?»
Я НАКІРОЎВАЮСЯ Ў ГОТЭМСКУЮ ПРЫСВІТЭРЫЯНСКУЮ БАЛЬНІЦУ, КАБ ЗНАЙСЦІ КРЫНІЦУ ІНФЕКЦЫІ.
КАЛІ Я АТРЫМАЮ ТОЕ, ШТО ШУКАЮ, ЗМАГУ ДАСЛАЦЬ ФОРМУЛУ СУАДНОСНЫХ ЛЕКАЎ ПРАМА НА ТЭРМІНАЛ. БУДЗЬ УВАЖЛІВЫ.
ГОТЭМСКАЯ ПРЫСВІТЭРЫЯНСКАЯ БАЛЬНІЦА? ЯНА Ў ЦЭНТРЫ ГОРАДА...


І?
ВЕДАЮ, МЫ СПРАБАВАЛІ ШТОСЬЦІ ПАДОБНАЯ СПЛАНІРАВАЦЬ, НАКОЛЬКІ ГЭТА МАГЧЫМА. БОЖА, Я Ў ПУЛЬТА З ГАРМАТАЙ, ЯКАЯ ЗАРАДЖАНА ТРАНКВІЛІЗАТАРАМ. ГАТОВЫ РАСПЫЛІЦЬ ЛЮБЫ ГРОБАНЫ ЦУДОЎНЫ ПЫЛ, ЯКІ ТЫ НАШКРАБЕШ...
...АЛЕ КАЛІ БАЧЫШ ГЭТА. НАКОЛЬКІ ЎСЁ ДРЭННА... Я МАЮ НА ЎВАЗЕ, ЖЫЎЦОМ. ГЭТА ГОРШ ЛЮБОГА...
ХІІІІ...
БОЖА.
ЯКОЙ БЫ ЧАРТАЎНЁЙ ГЭТА НІ БЫЛО, БЭТМЭН, ЯНО **ШТОСЬЦІ** ПАКІДАЕ АД ЧАЛАВЕКА. ГЭТА НЕШТА ПЕРАЎТВАРАЕ СПАКУСУ Ў **НЯНАВІСЦЬ**, ШТОСЬЦІ ТАКОЕ. СЯБРЫ ПРЫХОДЗЯЦЬ ЗА СЯБРАМІ. **ХАРВІ** СПРАБАВАЎ... НЕ СЛУХАЙ МЯНЕ.
...УЛІЧВАЮЧЫ, ШТО ЛЮДЗІ ДУМАЮЦЬ ПРА **ЦЯБЕ**, ХУТЧЭЙ ЗА ЎСЁ, ТЫ БУДЗЕШ САМАЙ ЗАПАТРАБАВАНАЙ АСОБАЙ У ГОТЭМЕ, КАЛІ ПАКАЖАШСЯ.
БЭТМЭН? БЭТМЭН, ТЫ ТУТ?


БЭТМЭН?..


УГЛЯДЗІСЯ. ГЭТА ВІРУС. ЯГО МОЖНА ВЫЛЯЧЫЦЬ.
BYTERIAN HOSPIT
БЭТМЭН?
Я ТУТ. УЖО НАБЛІЖАЮСЯ ДА ШПІТАЛЯ.
Я АТРЫМАЮ ТОЕ, ШТО МНЕ ТРЭБА ДЛЯ ЛЕКАЎ. МАГЧЫМА, ТЫ ЗМОЖАШ ЗНАЙСЦІ ШТО-НЕБУДЗЬ КАРЫСНАЕ АБ ГОТЭМСКАЙ ПРЫСВІТЭРЫЯНСКАЙ БАЛЬНІЦЫ.
ПЕРШАЕ, ШТО ЎСПЛЫВАЕ Ў ГАЛАВЕ, ГЭТА НАЙСТАРЭЙШЫ ШПІТАЛЬ У ГОРАДЗЕ.
ФІНАНСУЕЦЦА ЎЭЙНАМІ... СПАЧАТКУ ПЕРАЖЫЎ ШЭРАГ ТРАГЕДЫЙ. АБОДВУМ МАІХ ДЗЕЦЯМ ВЫДАЛІЛІ ГЛАНДЫ ЗА ДЗЕНЬ ДА ТАГО, ЯК ЯГО ДАХ АБВАЛІЎСЯ...
ЛЮДЗІ КАЖУЦЬ, У ІМ ЖЫВУЦЬ ЗДАНІ. СТРАШНАЕ МЕСЦА. НЕШАНЦОВАЕ.
БЕРАЖЫ СЯБЕ.
УХ. ПАСПРАБУЮ.
HAHAHAHA HAHAHAHA HAHA
ГЭТА БЫЎ ЖАРТ.
ШТО Ж, ІМ ЁН ПАКАЗАЎСЯ СМЕШНЫМ.
КАНЕЦ СУВЯЗІ.


БЭЭЭЭЭЭТСССС.
HA HA HA HA HA HA HA HA
ГЭТА ГОРШ, ЧЫМ ТЫ ДУМАЎ.
АЛЬФРЭД МЕЎ РАЦЫЮ НАКОНТ ТАГО, ШТО ГЭТА ШЭДЭЎР. НУ І ШТО З ТАГО?
ТЫ МОЖАШ ГЭТА ЗРАБІЦЬ. ТЫ МОЖАШ...
ТЫ НЕ МООООЖАШ...
ТЫ НЕ МООООЖАШ БЫЦЬ ТУУУУТ...
HA HA HA HA HA HA HA HA HA HA HA
«ДОМ СА ЗДАНЯМІ...»


«...З-ЗА ЯГО ГІСТОРЫІ **НЕВЫТЛУМАЧАЛЬНЫХ** ТРАГЕДЫЙ ГЭТЫ ДОМ ЗНАХОДЗІЦЦА Ў СПІСЕ САМЫХ УЛЮБЛЁНЫХ ЗДАНЯМІ МЕСЦАЎ У ГОРАДЗЕ».
«ВЫШЭЙ ТОЛЬКІ ДЗІЦЯЧУ ШПІТАЛЬ УІЛЛОЎВУД».
TRAGIC FIRE
GOTHAM PRES
«ПАСЛЯ **ПАЖАРА** Ў 1910, ЯКІ СТАЎ ПРЫЧЫНАЙ СМЕСЦІ КАЛЯ ПЯЦІДЗЕСЯЦІ ПАЦЫЕНТАЎ, ПАЙШЛІ ЧУТКІ, ШТО ГЭТЫЯ КАЛІДОРЫ НАВЕДВАЕ САМ **Д'ЯБЛ**...»
ЭХ.
АГА, ГЭТА ЗАВЕЦЦА ХАЛАТНАСЦЬ. І НІЯКАЙ ВЕЛЬЗЕЎ...
...


PATIENT
ТРАГЕДЫЯ Ў 1946, КАЛІ ЛЕКІ ПАДМЯНІЛІ НА ПАЦУЧЫ ЯД У ПАЛАЦЕ Б'ЮЛІ.
ШТО ЗА...
CREAK


ХТО ТАМ?!
ХТО Б ТЫ НІ БЫЎ, Я ЧУЮ, ШТО ТЫ ТАМ! У ЦЯБЕ ЁСЦЬ ТРЫ СЕКУНДЫ, КАБ УПАСЦЬ ДА ЗЯМЛІ І...
УХ!
ТУК-ТУК.


ХТО ТАМ?
ПАКУЛЬ НЕ МАГУ СКАЗАЦЬ. АЛЕ Я ЯГО **БАЧУ**. ПАЛАТА, ЗДАЕЦЦА, У ПАРАДКУ.
ДАШЛІ МНЕ КОД, ПЕННІ-ДВА.
Я ЗМЯНІЛА ЯГО НА «БЭТ-ЛЕКІ». ШТО, ЗНАДТА НАХАБНА?
ТЫ ДАЧКА СВАЙГО БАЦЬКІ...
БЭТМЭЭЭННН...
НЕ МОЖА БЫЦЬ...
ХТО? БРУС, ХТО ГЭТА?
ДЖОЧЫЛ.
ЧАЛАВЕК, ЯКІ ЗАБІЎ ТВАІХ БАЦЬКОЎ...



АЛЕЯ ЗЛАЧЫН-СТВАЎ.
ЁН ВЕДАЕ...
ZORRO
ПАМА-ЖЫЦЕ.
TICKETS
УСЁ БУДЗЕ Ў ПАРАДКУ, **ДЗЫЮК**. УСЁ БУДЗЕ...
КАЛІ ЛАСКА, ХТО-НЕБУДЗЬ..
NNNOOOOOO!



«ТОЛЬКІ НЕ ГЭТА!»
А НУ ПРАВАЛЬВАЙ АДСЮЛЬ! ТЫ НЕ... ТЫ НЕ...
ВОЙ, ДЖЫМБА, СУНЯМІСЯ...
...МНЕ СТОЛЬКІ НОВАГА МАТЭРЫЯЛА ТРЭБА АПРАБАВАЦЬ! ХА ХА ХА ХА!
НОВЫЯ ЖАРТЫ, НОВЫЯ ФОКУСССЫ... ГЛЯДЗІ-КА!
SNAP
БАЧЫЎ?! ТРОХІ ПАЛІВА, АГНІВА Ў ТУФЛЯХ І...
...У МЯНЕ ЦЭЛАЯ НОВАЯ ПРАГРАМА!
«ХТО ТЫ?»


ГЭЙ! Я ТАБЕ КАЖУ! СТОЙ ТАМ!
Tickets
NOW PLAYING Z
ХІІІ...
...КАЛІ ЛАСКА...
ТОЛЬКІ НЕ ЗНОЎ.
ТОЛЬКІ НЕ ЗНОЎ.
НЕ... ХІХІХІ... ТОЛЬКІ НЕ ЗНОЎ.
«ХУТЧЭЙ! ЗРАБІ ШТО-НЕБУДЗЬ!»



ВАРУХНЕШСЯ, І Я ЗАСТРАЛЮ ЦЯБЕ, ДЖОКЕР!
БОЛЬШ НІЯКІХ ТАННЫХ ТРУКАЎ, НІЯКІХ ПАДРОБЛЕНЫХ ФОТА І ЖАРТАЎ!
ЧЫМ ТЫ ПРЫКІДВАЕШСЯ? ЧЫМСЬЦІ **АСАБЛІВЫМ**? З ТАБОЙ УСЁ СКОНЧАНА!
ВЕДАЕШ, МАГЧЫМА, ТЫ І МАЕШ РАЦЫЮ, КАМІСССАР.
МАГЧЫМА, ГЭТЫМ РАЗАМ ГЭТА ЗУСІМ І **НЕ** ЖАРТ.
СТОЙ НА МЕСЦЫ!
ХІ.
181935







БАЧЫШ, **ДЗЬЮК?** УСЁ У ПАРАДКУ. БЭТ...
ГЛЯДЗІЦЕ!
МАЕ БАЦЬКІ! ЯНЫ...
ЯНЫ **АТРУЧАНЫЯ**! НЕ СПЫНЯЙСЯ!
ДЖЫМ!
БЭТМЭН! ЯГО **НЯМА**!


Я ЗРАБІЎ ГЭТА! ЁН ПРЫЙШОЎ ДА МЯНЕ І Ў МЯНЕ НЕ БЫЛО ВЫБАРУ, Я ПРОСТА... Я ГЭТА ЗРАБІЎ.
ЯГО НЯМА, БЭТМЭН. ЦЕЛА І КРОЎ. ПОМЕР.
НІЯКАЙ МАГІІ. НІЯКАГА ПЕРАРАДЖЭННЯ.
НЕ ГЛЯДЗІ НА ІХ, БРУС.
ЯНЫ ПАД КАПЯЛЬНІЦАЙ. У ЦЯБЕ ЁСЦЬ ЧАС. ТЫ ВЫРАТУЕШ ІХ. ТЫ ЗНОЙДЗЕШ ЛЕКА І ВЫРАТУЕШ ІХ УСІХ. У ЦЯБЕ ЁСЦЬ НЕКАЛЬКІ ГАДЗІН.
ВЕДАЮ, БЭТМЭН, ГЭТА ЖОРСТКА. ВЕДАЮ, ГЭТА ВЫГЛЯДАЕ ТАК, БЫЦЦАМ (ХЕХ) ЗДАЕЦЦА, ТУТ УСЁ, НУ, ГАРЫЦЬ... АЛЕ ПА МЕНШАЙ МЕРЫ...
ШТО МАЕМ, ТОЕ МАЕМ.


АААААААА!!!
ДЖЫМ!
ДЖЫМ!
ДЖЫМ, ТЫ
ЧУЕШ?!
ЗДАРОЎ,
БРУС.
ПРАЦЯГ БУДЗЕ!


TAKE-OUT
THE FIRST LAUGH
WRITTEN BY JAMES TYNION IV
ART BY JOHN MCCREA
COLORS BY MICHELLE MADSEN
LETTERS BY TAYLOR ESPOSITO
«ГЭТА ГАЛАСАВАЯ СКРЫНЯ СУПРАЦОЎНІКА ЛЯКАРНІ АРКХЭМ ЭРЫКА БОРДЭРА... КАЛІ ЛАСКА, ПАКІНЬЦЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ ПАСЛЯ ГУДКА».
«ЭРЫК... ЭРЫК, ТЫ ПАВІНЕН ДАПАМАГЦІ МНЕ... ГЭТА МАХРЫН. МЯНЕ ВЫКРАЛІ ЎЦЕКАЧЫ, А ГОТЭМ ПЕРАТВАРАЕЦЦА Ў НЕЙКАЕ ПЕКЛА».
«Я ВЫКРАЛА ТЭЛЕФОН ЗАГІНУЛАГА. ПАЛІЦЫЯ НЕ БЯРЭ ТРУБКУ...»
«...СМЕХ... МНЕ БОЛЬНА ЯГО ЧУЦЬ, ЭРЫК. ЁН АЖЫГАЕ».
«Я... Я БЫЛА ЭГАІСТКАЙ... Я ХАЦЕЛА ВЕДАЦЬ. ЯНЫ СЦВЯРДЖАЮЦЬ, ШТО ЁН РАЗМАЎЛЯЎ З ІМІ. ДЖОКЕР... ТЫ ВЕДАЕШ ПРА МАЁ ДАСЛЕДВАННЕ».
«ЯНЫ КАЖУЦЬ, МЫ ДАВЕДАЕМСЯ ПРАЎДЫ. ХТО ЁН НА САМОЙ СПРАВЕ... АЛЕ КОЖНАЯ ГІСТОРЫЯ ШАЛЁНЕЙ ЗА РАНЕЙШУЮ. Я ХАЦЕЛА ВЕДАЦЬ. Я ХАЦЕЛА ДАЙСЦІ ДА КАНЦА».
«АЛЕ ГЭТА ЎЖО ЗАНАДТА. ТАБЕ НЕ ТРЭБА БЫЛО АДПРАЎЛЯЦЬ МЯНЕ ДАДОМУ СЁННЯ».
ЧАМУ ТЫ АДПРАВІЎ МЯНЕ ДАМОЎ?


GULP
МОРТАН, ПРАШУ...
ТЫ Ж АДЧУВАЕШ ГЭТА, САПРАЎДЫ... ЯК ЁН ГРАХОЧА Ў МЯНЕ Ў ГАЛАВЕ... СМЕХ. ГЭТА ДРЭННА. ГЭТА ДРЭННА, **ДРЭННА** ДЛЯ ГОТЭМА.
АДПУСЦІ МЯНЕ, І Я ПАМАГУ **ЎСІМ** НАМ.
НЕ, МНЕ ТРЭБА **ВЕДАЦЬ**.
МНЕ ТРЭБА ВЕДАЦЬ, ШТО МАМА БЫЛА НЕ ПРАВА. ЯК І КАЗАЛІ ДАКТАРЫ. ЯНА НЕ МОЖА БЫЦЬ... ЗНАК. ЁН СКАЗАЎ МНЕ ШУКАЦЬ ЗНАК.
МОРТАН?
ГЭТА ВАШЫ **ВОЧЫ**, ДОКТАР ЗАХІР. МАКІЯЖ ПАЦЁК... СУМНЫ БЛАЗАН.
О БОЖА, УСЁ ЯК ЁН І СКАЗАЎ...
...ГЭТАГА НЕ МОЖА БЫЦЬ... НЕ МОЖА БЫЦЬ...
ЧАГО НЕ МОЖА БЫЦЬ?
Я БЫЎ БАЛБЕСАМ. ТАК КАЗАЛА МАМА. ВЯЛІКІМ БАЛБЕСАМ. ЗАЎСЁДЫ ЖАРТАВАЎ, ВЕСЯЛІЎСЯ. Я НЕ БЫЎ ВЫДАТНЫМ ВУЧНЯМ. АЛЕ МНЕ ПАДАБАЛАСЯ ЧУЦЬ, ЯК УСЕ СМЯЮЦЦА.
НАСТАЎНІЦА АДНОЙЧЫ ВЫКЛІКАЛА МАЦІ І ЯНА МОЦНА АДЛУПІЛА МЯНЕ. І РАСКАЗАЛА МНЕ ГІСТОРЫЮ.


«ГІСТОРЫЮ ПЕРШАГА СМЕХА Ў ГОТЭМЕ».
«ГЭТА БЫЛО Ў СТАРАДАЎНІЯ ЧАСЫ, КАЛІ... ГОРАД... БЫЎ СУМНЫМ, ШЭРЫМ МЕСЦАМ. НІХТО НЕ ЎСМІХАЎСЯ. УСЕ ПРОСТА ПРАЦАВАЛІ НА СВАІХ БРУДНЫХ, БРУДНЫХ ФАБРЫКАХ І ВЯРТАЛІСЯ Ў СВАЕ БРУДНЫЯ, БРУДНЫЯ ДАМЫ».
«АЛЕ ТАК БЫЛО НЕ ЗАЎСЁДЫ. ГОТЭМ ВЫРАБЛЯЎ. БОЛЬШ, ЧЫМ КАЛІ-НЕБУДЗЬ. ГЭТА БЫЛО ЗМРОЧНАЕ МЕСЦА, АЛЕ ТАК І ПАВІННА БЫЛО ЗАСТАВАЦЦА».
«АЛЕ БОСЫ НЕПАКОІЛІСЯ ЗА ПРАЦАЎНІКОЎ. ІМ СТАНАВІЛАСЯ ЎСЁ ГОРШ І ГОРШ. І МНОГІЯ З ІХ ПАЧЫНАЛІ ЗЛАВАЦЦА».
«ЯНЫ ВЕДАЛІ, ШТО КАЛІ НІЧОГА НЕ ЗРАБІЦЬ, ТЫЯ ЗМОГУЦЬ ДАЦЬ АДПОР. ЯНЫ МОГУЦЬ ПАЎСТАЦЬ. АЛЕ ЯНЫ НЕ МАГЛІ ДАЦЬ РАДЫ, ШТО РАБІЦЬ».
«І ТАДЫ З'ЯВІЎСЯ ЁН...»
«МАМА НЕ ВЕДАЛА ЯГО ІМЯ. ЛІЧУ, ЛЮДЗЕ ТАКСАМА НЕ ВЕДАЛІ... АЛЕ БЛАЗАН СКАЗАЎ ЯМУ, ШТО МОЖА ЗРАБІЦЬ НЕМАГЧЫМАЕ».
«ЁН МОЖА ЗРАБІЦЬ УСІХ ШЧАСЛІВЫМІ. ЁН МОЖА ПРЫМУСІЦЬ ГОРАД СМЯЯЦЦА».
«ТАКІМ ЧЫНАМ ЁН АБЫХОДЗІЎ ФАБРЫКУ ЗА ФАБРЫКАЙ... І ПАКАЗВАЎ ІМПРЭЗЫ. УСЁ ПАЧАЛОСЯ З НЕКАЛЬКІХ УСМЕШАК... АЛЕ СМЕХ З КОЖНЫМ РАЗАМ УЗМАЦНЯЎСЯ... ЯНЫ ЎСЕ СМЯЯЛІСЯ І СМЯЯЛІСЯ».
«СМЯЯЛІСЯ, ПАКУЛЬ НЕ ПАЧЫНАЛІ КАШЛЯЦЬ КРЫВЁЙ. ПРЫЙШЛІ ДАКТАРЫ, АЛЕ ЯНЫ РАНЕЙ НЕ СУСТРАКАЛІСЯ З ПАДОБНЫМ».
«ШАСЦЬДЗЕСЯТ ЧАЛАВЕК ЗАГІНУЛА ТОЙ НОЧЧУ».


«ЯГО СПРАБАВАЛІ СПЫНІЦЬ, АЛЕ ЁН ПРАЦЯГВАЎ... ФАБРЫКА ЗА ФАБРЫКАЙ. І БЫЛО ЎСЁ ТОЕ Ж САМАЕ, ПАКУЛЬ НЕ ЗНАЙШЛІ, ДЗЕ ЁН ХАВАЕЦЦА, ЗА ГОРАДАМ».
«ЛЮДЗІ ГОТЭМА ВЕДАЛІ, ШТО ПРЫЙДЗЕЦЦА СПАЛІЦЬ УСЁ ДА ПОПЕЛА».
«АЛЕ ПОТЫМ ЯНЫ ПАЧУЛІ ЗНУТРЫ ХІХІКАННЕ І ВІСК... І БЛАЗАН ВЫЙШАЎ **ЗАВІТАЦЬ** ІХ».
«ЁН ГАРЭЎ, АЛЕ НЕ СПЫНЯЎСЯ. ЁН ЖАНГЛІРАВАЎ І СМЯЯЎСЯ, ПАКУЛЬ НЕ ПЕРАЎТВАРЫЎСЯ Ў ПОПЕЛ».
«ЯНЫ СПРАБАВАЛІ ПРА ГЭТА ЗМАЎЧАЦЬ, РАЗУМЕЕЦЕ? ПРАДАЛІ ЗЕМЛЮ НЕЙКАЙ ХІМІЧНАЙ КАМПАНІІ».
«АЛЕ Ў ГОТЭМЕ БЫЛО ПРАВІЛА. НЕ ЗАКОН, ЯКОЕ НАВАТ НЕ КАЗАЛІ ЎСЛЫХ... АЛЕ **БЛАЗАНАМ** ТУТ НЕ МЕСЦА».


«ЯНА НАПУЖАЛА МЯНЕ, ГЭТА ГІСТОРЫЯ. ЯНА НАПУЖАЛА МЯНЕ ТАК МОЦНА. Я НЕ ХАЦЕЎ СМЯШЫЦЬ ІХ… АЛЕ ЯНЫ САМІ НЕ СУПАКОЙВАЛІСЯ. АКАЛЯЮЧЫЯ ЛЮДЗІ».
«Я ЎЦЯКАЎ… СПРАБАВАЎСЯ ЗНАЙСЦІ НЕЙКАЕ ЦІХАЕ МЕСЦА. БЯСПЕЧНАЕ МЕСЦА».
«АЛЕ Я ЧУЎ ЯГО ЗНОЎ…»
THE BIG LAU
«…ЯНЫ НЕ РАЗУМЕЛІ. У ГЭТЫМ ГОРАДЗЕ СМЕХ ЯК ХВАРОБА. ЁН РАСКЛАДАЕ ВАС ЗНУТРЫ. ЁН РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА, ПАКУЛЬ НЕ **ЗНІШЧЫЦЬ УСЁ**».
«ЯНЫ ПАВІННЫ БЫЛІ ВЕДАЦЬ…»
«…У ГОТЭМЕ, КАЛІ СМЯЕШСЯ, **ПАМІРАЕШ**».
«Я СПРАБАВАЎ **ПАТЛУМАЧЫЦЬ** ІМ… АЛЕ… Я ТРОХІ З'ЕХАЎ З ГЛУЗДУ».


ПАГЛЯДЗІ НА ІХ... ГЭТА АДБЫВАЕЦЦА ЗНОЎ... ТОЛЬКІ ЦЯПЕР СМЯЮЦЦА ЎСЕ.
ЯК ЁН І СКАЗАЎ. ЯК ЁН І СКАЗАЎ, КАЛІ ПРЫЙШОЎ.
УСЕ ТАК ДОЎГА ЦІКАВІЛІСЯ, ХТО Я. УСЕ ХАЦЕЛІ ВЕДАЦЬ.
АЛЕ НЕ ТЫ... КАЛІ Б ТЫ БЫЎ ТАМ, ТЫ Б БАЧЫЎ. ТЫ Б АДРАЗУ ЎСЁ ЗРАЗУМЕЎ.
МАЛА ЗАСТАЛОСЯ ЛЮДЗЕЙ, ЯКІЯ ВЕДА-ЮЦЬ САПРАЎДНУЮ ГІСТОРЫЮ. ТВАЯ СТАРАЯ МАЦІ БЫЛА АДНОЙ З АПОШНІХ.
Я СТОЛЬКІ ГАДОЎ ШЛЫНДАЎ ПА ВУЛІЦАХ, З ТЫХ САМЫХ ЧАСОЎ, ЯК ЯНЫ СПАЛІЛІ МЯНЕ ДА ПО-ПЕЛУ. З КОЖНАЙ УСМЕШ-КАЙ, ХІХІКАННЕМ, РАГА-ТАННЕМ Я СТАНАВІЎСЯ МАЦНЕЙ...
БО Я НЕ ПАКОНЧЫЎ З ГОТЭМАМ, РАЗУМЕ-ЕШ? Я ПРЫЙШОЎ СЮДЫ ПРЫМУСІЦЬ СМЯЯЦ-ЦА ЎСІХ. ПРЫКОНЧЫЦЬ УСІХ.


ТО БЫЛА ТОЛЬКІ РЭПЕТЫЦЫЯ. Я НАВАТ НЕ РАСЧЭХЛІЎ СВОЙ **ЛЕПШЫ** МАТЭР'ЯЛ...
НЕ МОЖА БЫЦЬ... ДАКТАРЫ КАЖУЦЬ...
ЯНЫ ТАКСАМА ХУТКА БУДУЦЬ СМЯЯЦЦА. ВЫ ЎСЕ БУДЗЕЦЕ... АЛЕ ТАБЕ ПАТРЭБНЫ ДОКАЗЫ, ТАК?
ТАДЫ ТАБЕ ПРЫЙДЗЕЦЦА ЗРАБІЦЬ **УСЁ**, ШТО Я СКАЖУ.
Я НЕ... Я НЕ ВЕРУ Ў ГЭТА... АЛЕ МНЕ ТРЭБА ВЕДАЦЬ.
МНЕ ТРЭБА ВЕДАЦЬ, ШТО МАМА НЕ МЕЛА РАЦЫЮ. МНЕ ТРЭБА ВЕДАЦЬ, ШТО Ў ДЗЯЦІНСТВЕ, КАЛІ Я ПРЫМУШАЎ ІХ СМЯЯЦЦА, Я НЕ РАБІЎ ІХ МАЦНЕЙ.
Я ТОЛЬКІ ХАЧУ ДАДОМУ... У МАЮ КАМЕРУ З ПАДУШКАЙ. І ВАРТАВЫМ БІЛАМ, ЯКІ ПЯЕ МНЕ, КАЛІ НІХТО НЕ ЧУЕ.
АЛЕ... МНЕ ТРЭБА ВЫСВЯТЛІЦЬ.
УСЁ Ў ПАРАДКУ, МОРТАН... МЫ МОЖАМ ВЫСВЯТЛІЦЬ ГЭТА РАЗАМ. Я МАГУ ПАТЭЛЕФАНАВАЦЬ СВАЯМУ СЯБРУ... І НАМ ДАШЛЮЦЬ ДАПАМОГУ, КАБ МЫ БЫЛІ Ў БЯСПЕЦЫ.
ДАВАЙ ПРОСТА ЗРОБІМ ГЭТА, ПАКУЛЬ АСТАТНІЯ НЕ...
ПАКУЛЬ АСТАТНІЯ НЕ **ШТО**, ДОКТАР ЗАХІР?



ПРАЦЯГ БУДЗЕ!